## № 35. Ганьне Бабарэцы

*21/I–1931 г.*

Дарагая, любая Анечка!

Адсылаю з бруднай бялізны сарочку, кальсоны, наўлачку, 2 пары шкарпэтак, хустачку, ручнік, прасьціню.

Сарочкі ў мяне яшчэ ёсьць чыстыя, дык ты ў наступны раз іх не прынось, а толькі кальсоны.

Я, дарагія мае, здароў. Жыву думкай пра Вас. Рад за сваіх слаўных дзетачак, што растуць і не забываюць таты. Вітаю і моцна цалую сваіх любенятак дарагіх Лорачку і Лялячку. Расьцеце, любыя, і любеце тату.

Ці атрымала ты, любая, даручэньні і грошы? Сколькі ты палучаеш? Глядзеце сябе і шануйце здароўе.

Сёньнешнюю перадачу атрымаў. Шчыра і моцна дзякую. Кнігі чытаю яшчэ. Моцна цалую Вас усіх.

*Адам.*

## № 36. Ганьне Бабарэцы

*30/I–1931 г.*

Любая мая, дарагая мая Анечка!

Адсылаю з бялізны сарочку, кальсоны, хустачку, наўлачку, 2 пар[ы] шкарпэтак, ручнік, анучкі, торбу.

Ці атрымала ты даручэньні, што я пасылаў праз сьледаваценя?

Ці забрала ты грошы з „Камунара–асьветніка“? Калі яшчэ не, дык забяры.

Пабачэньня прасіў. Паліто ня трэба.

Любая, калі можаш, прысылай гародніны: моркаў, бручк[а], цыбуля, часнок.

Сёньнешнюю перадачу атрымаў. Моцна–моцна дзякую і горача вас усіх цалую. Лорачку і Лялячку моцна цалую. Я здароў.

Ліст напішу. Цалую моцна.

Ваш *Адам.*

## № 37. Ганьне, Элеаноры, Алесі і Анастасіі Бабарэкам

*31/I–1931 г.*

Дарагая мая і любая Анечка! Слаўныя мае любеняткі, Лорачка і Лялячка!
Дарагая мая мама!

Вітаньне Вам ад Вашага таты. Дарагія мае, родныя мае, усімі сваімі думкамі і імкненьнямі я з Вамі. А думкі гэтыя, як гэта Вы жывяце цяпер? Ці цёпла ў кватэры ў Вас? Ці маеце Вы абутак і адзетак? Ці не галодны Вы? Гэта–ж так усё нечакана здарылася. Ці ёсьць чаравікі ў цябе, Анечка, і ў Лорачкі, Лялячкі? Як мама? Ці ёсьць польты ў Лорачкі і Лялячкі? Мяне часта ахоплівае трывога за Вас. Ці памагае Вам Ігнась? Я часта Вас сьню, і тады бачу я, як Лорачка дзівіцца: „Чаму ты, тата, такі?“ Гэта так яна спаткала мяне, угледзеўшы мяне з вялікаю чорнаю бародаю. Бачу я Ля-